УДК 811.161.3:81’271 Н.Я. Савіцкая, ст. выкл. (БДТУ, Мінск)

## ВУСНЫЯ ФОРМЫ ДЗЕЛАВОГА МАЎЛЕННЯ

Вусныя формы маўлення з’ўляюцца неад’емнай часткай дзелавой камунікацыі. Аднак вуснае маўленне значна адрозніваецца ад пісьмовага, закранаючы ўсе ўзроўні моўнай сістэмы: фанетычны, лексічны, граматычны.

Пісьмовае маўленне захоўвае ўсе важнейшыя прыкметы афіцыйна-справавога стылю, а ў вуснай форме дзелавога маўлення забяспечыць павышаныя патрабаванні дакладнасці практычна немагчыма.

Вуснае маўленне арыентавана на непасрэднае ўспрыняцце, а само паведамленне выглядае як зараней непадрыхтаванае, якое ўзнікла ў момант маўленчых зносін. Для вуснага маўлення характэрны агаворкі і самаперабівы, перабудовы па ходу выказвання, недастатковая колькасць ці адсутнасць злучальных сродкаў. Арганізуючым пачаткам маўленчай плыні з’яўляецца ход развіцця думкі. Канструкцыі, якія ўключаюць некалькі даданых сказаў, у вусным маўленні рассыпаюцца, змешваюцца, застаюцца незакончанымі. Для вусных зносін характэрна павышаная ўвага моўніка да знешняга боку свайго маўлення. Існуюць разнастайныя прыёмы актуалізацыі слоўнай формы выказвання. Пры вусным маўленні важна звярнуць увагу на слуханне як від маўленчай дзейнасці. Вуснае маўленне мае на ўвазе наяўнасць слухачоў, дзе агульныя веды ў працэсе камунікацыі, агульныя інтарэсы і ўзаемапаразуменне з’яўляюцца зыходным момантам камунікацыі, складаючы “план моўніка” і “план слухача”.

Аўдзіраванне – гэта вельмі складаны працэс маўлення і думкі, якое падраздзяляецца на два віды – нерэфлексіўнае (без выражанай рэакцыі на пачутае) і рэфлексіўнае (з выражанай рэакцыяй на паведамленне).

Тэмы абмеркавання ў дзелавым вусным маўленні задаюцца мэтавай устаноўкай зносін. Ва ўмовах неафіцыйнай камунікацыі абмяркоўванне дзелавых пытанняў перамяжаецца з абмеркаваннем свецкіх тэм, якія нельга аднесці да ліку патэнцыяльна канфліктных: культура, спорт, гастранамія, надвор’е. Варта адзначыць, што ў адпаведнасці з нормамі этыкету (як еўрапейскага, так і ўсходняга) у лік непажаданых тэм уваходзяць: палітыка, рэлігія, сэкс, здароўе, фінансавыя праблемы.

Разнавіднасці афіцыйнага дзелавога маўлення – делавая размова, гутарка, абмеркаванне, субяседаванне, спрэчка, палеміка, дыскусія, дэбаты, прэніі, дыспут, перагаворы, таргі – маюць свае асаблівасці.